# «Яблыня ў фаце»

## МІХАСЬ БОЛСУН

Паэт у сваіх нататках згадвае:

*Лёсам мне было вызначана нарадзіцца 23 лютага 1942 года у вёсцы Балсуны Чачэрскага раёна ў сялянскай сям'і. Дзяцінства прайшло там жа. У свой час скончыў Палескую СШ, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны, аддзяленне журналістыкі Мінскай ВПШ.*

*Працаваў рабочым саўгаса на Украіне, загадчыкам сельскай бібліятэкі, настаўнікам у вёсцы Палессе. Служыў у Савецкай Арміі.*

*З 1965 года – на журналісцкай рабоце. Літсупрацоўнік, загадчык аддзела, адказны сакратар, намеснік рэдактара – такі мой шлях у чачэрскай раённай газеце «Трыбуна камунізму». Сем гадоў працаваў галоўным рэдактарам буда-кашалёўскай газеты «Авангард», семнаццаць – старшым рэдактарам і загадчыкам аддзела Гомельскага абласнога тэлерадыёаб'яднання.*

*Член Саюза журналістаў Беларусі. Зараз жыву ў Гомелі.*

*Вершы пачаў пісаць яшчэ школьнікам. Друкаваўся ў розных перыядычных выданнях, удзельнічаў у літаратурных перадачах на тэлебачанні і радыё.*

«Яблыня ў фаце» (2004) – першы самастойны паэтычны зборнік пісьменніка, які ён прысвяціў сваім землякам – жыхарам Чачэршчыны.

Сваё паэтычнае верую паэт увасобіў у вершы «Мая зямля»:

Жыхар бязмежнага Сусвету
З праіскай даўняй на Зямлі,
Мне выбраў лёс планету гэту,
Дзе продкі ўсе мае жылі.

Між зор касмічнае прасторы
Ляцяць Сатурн, Венера, Марс...
І ўсё ж Зямлі радней уборы.
Яна – выток і спраў, і мар.

Яна – прыгожая адвечна,
Яна – любімая найбольш,
Ці спёка дзённая, ці вечар,
Ці холаду гуляе золь.

Ёй так да твару колер кветак,
Блакіт азёр, калассе ніў,
Снягі зімой і дождждык летам,
У гмахах яркія агні.

Кружляе ў космасе планета,
А з ёй Чачэрск мой, сіні Сож.
І гэты сонцам свет сагрэты,
Крывавы Марс, не патрывож!

Па творах Міхася Болсуна можна вывучаць ландшафт роднай Чачэршчыны, якая сталася *бліжэй, мілей, чым шаты раю*. Ён любіць адвечны бег рэчак Чачора, Сож, Каўпіта, Покаць, якія выступаюць як працаўнікі («Прыстань Крэмель»), ці проста як калыска, дзе ўзгадавалася дзяцінства («Вячэрняя Каўпіта»), ці велічны сімвал быцця («Жыццё-рака»), над якім іграе вясёлка (аднайменны верш), а пад яе дугою Сож імкнецца да сваёй нявесты – плыткае Чачоры. Зборнікі паэзіі М. Болсуна – гэта паэтычныя слоўнікі-даведнікі назваў роднай зямліцы, невыпадкова аўтар у адным з ягоных праграмных вершаў так і ўсклікае – «Родныя назвы», бо

Ці вёска гэта, ці рачулка –
Іх назвы музыкай гучаць.
Кранае слоўца нас прачула,
Бы спеў салоўкі па начах.

Палессе, Ніцкі і Залессе,
Заручча, Добрынь і Гаёк,
Гучыць у назвах гэтых песня,
Што чую сэрцам я здалёк.

Яго сустрэнуць урочышча Лысуха і Сухі Ручэй, Замкавая гара ў Чачэрску, артэфакты старажытнасці і не такой ужо далёкай мінуўшчыны – маміна самапрадка, чачэрскія набожнікі, вытканыя ў адпаведнасці са старадаўнімі традыцыямі, гарадская ратуша, што хавае былыя таямніцы, дзедава і бацькава хаты, роднае поле, хлеб дабрыні, брацкія магілы, абеліскі ў жыце.

Ён – дзіця вайны, пра што згадае ў вершах «Гімнасцёрка», «Салдатка», «Кашуля», «Дзень вызвалення», «Сорак чацвёрты. Спакойнае лета...», «Ордэны».

Відаць, гэтая любоў і памяць і натхняе паэта на стварэнне шматлікіх лірычных замалёвак і імпрэсій, у якіх ён, дзіця краю, услаўляе родную прыроду ва ўсе поры года. Усклікаючы з гонарам: *Я – радзіміч!*, ён сцвярджае:

Чым больш жыву,
Тым больш люблю
Цябе, мой край
Чачэрскі.

Ён апісвае аблокі над Чачэрскам, высокі купал неба над роднай хатай, бадзягу-туман, што спаўзае ў нізіны, аўтографы, што расою пішуць падэшвы, жыты, што шапочуць пад ветрыкам, бярозу палескага краю, сады, што цвітуць. Падчас захаплення нельга стрымаць, і тады ён пачынае спяваць, як у вершы «Народная песня»:

Чыста, напеўна, шчымліва
Голас жаночы звініць.
Чую, здаецца, шэпт нівы,
Гоман палескіх крыніц.

Голас вадзіцы крынічнай зберагае зямлю, так і песня крынічная дапаможа ўратаваць жыцці. Вось чаму М. Болсун стварыў песню-гімн маленькай радзіме, якую і назваў адпаведна – «Чачэрская ўрачыстая»:

Памяць і сэрца не здрадзяць ніколі
Роднай, як маці, чачэрскай зямлі.
Марылі продкі пра шчасную долю –
З цемры да сонца мы выйсці змаглі.

ПРЫПЕЎ:
Хвалі Чачоры, блакітнага Сожа
Гойдаюць веліч ажыўшых надзей.
Нашы абсягі квітнеюць прыгожа –
Працу шануем, зямлю і людзей.

Ратушы вежы і бор ля Палесся,
Помнікі мужнасці, колас тугі,
Танец задорны, народная песня
Славяць сягоння наш край дарагі.

ПРЫПЕЎ.

Верныя дружбе народаў-суседзяў –
Сэрцы ніяк не прызналі мяжы –
Мы расіян, украінцаў прывецім,
Знаем і самі цяпло іх душы.

ПРЫПЕЎ.

Клічуць наперад крылатыя мары,
Сонечным бачыцца заўтрашні дзень.
Светлыя ўнукам пакінем абшары –
Цвёрды наш поступ у рупнай хадзе.

ПРЫПЕЎ.

Родны край лякуе лепш, чым самыя спрактыкаваныя дактары. А яшчэ лечыць ад нуды і самоты каханне, бо рукі жанчыны – лёгкія крылы (так назваў адзін са сваіх цыклаў паэт, які ўслаўляе вусны адзінай, бо яны саладзейшыя за суніцы, а першыя словы любові, як і каханне першае, ніколі не забудуцца, хаця б таму, што пасля начных паездак на лодцы па Чачоры з'яўляюцца маленькія дачушка і сынок. А таму няхай заўсёды ў гэтым жыцці цвітуць *валошкі на ўзмежку* (назва раздзела са зборніка «Там, дзе задумлівы Сож»).

У поўнай адпаведнасці з традыцыяй, Міхась Болсун здольны бачыць смешнае і недарэчнае ў нашым быцці. Менавіта таму цікавымі ўяўляюцца ягоныя «Пярчынкі», а таксама пародыі на творы сваіх землякоў, як у «Одзе бочкам», дзе з гумарам адзначаюцца адметнасці творчай манеры паэта, што нарадзіўся на Буда-Кашалёўскай зямлі:

*...Я жыць хачу без рэпетыцый...*
*...Мой дзед быў спец па бочках,*
*Хто набываў іх – жыў не пуста...*
*...Маё зялёнае каханне...*

*Анатоль Зэкаў*

Я жыць прывык без рэпетыцый.
Бо ў бочках дзеда знаю толк.
Прыеду ў вёсачку з сталіцы,
Нясуць са склепа мне на стол
Гурочкі хрумсткія, капусту
І сала тоўстае з кубла,
А ў жываце не будзе пуста –
Пацягне зноў на край сяла.
Маё зялёнае каханне
У дзьмухаўцах тут, за сялом,
Калісьці лашчыў да світання,
Хоць рэпетыцый не было.

Ліліся ліўнем самі словы.
І млела ў думках галава.
Там і праклюнуўся верш новы.
Хвала Патапаўцы, хвала!

Займальна і разам з тым дакладна адзначае М. Болсун пэўныя агрэхі ў вершах Міколы Шабовіча, Генадзя Говара, ЛідзіАны. З'едліва ён падсмейваецца над жаночай зайздрасцю, вершаплётамі розных узроўняў, паэтаў, адарваных ад рэчаіснасці.

Разам з тым ён піша пасланні-прысвячэнні сваім калегам па пяру М. Дзямчыхіну, А. Грачанікаву, М. Мятліцкаму, А. Дуброўскаму, Н. Шкляравай, В. Ткачову, М. Сліве. Менавіта яму ўдзячныя паэты Чачэршчыны за выданне анталогіі вершаў мясцовых літаратараў да 850-годдзя Чачэрска.



4 зак. 8585